Том 17 • 2017 ACTA ALBARUTHENICA ISSN 1898-8091

**Зміцер Кузьменка, Вольга Сямашка**
Мінск

# Практыка і праблематыка мемарыялізацыі на землях паўстання 1863–1864 гг. (на прыкладзе Мастаўлян і Ялоўкі)

Мемарыялізацыя памяці любой гістарычнай з'явы ці постаці з'яўляецца лагічна запатрабаваным сістэмным сацыяльна-культурным працэсам, які патрабуе максімальнага ахопу ўсіх складнікаў, што могуць паўплываць на ўсведамленне і бачанне самога канструкту памяці.

Адрозненні ў ацэнцы паўстання 1863–1864 гг. і ролі яго кіраўнікоў у гісторыі Беларусі, якія выяўляюцца падчас дыскусіяў на рознага роду гістарычных і калягістарычных пляцоўках, часта абумоўленыя не толькі прыналежнасцю апанентаў да розных гістарычных школ ці палітычных лагераў. Апрача суб'ектыўных фактараў немалую ролю адыгрываюць фактары аб'ектыўныя, у прыватнасці, геаграфічны. Жыхары розных рэгіёнаў могуць неаднолькава ставіцца да пэўнай гістарычнай падзеі, асабліва, калі гэтыя рэгіёны мелі істотныя асаблівасці развіцця – палітычныя, эканамічныя, культурныя, канфесійныя.

У цэлым, беларускае грамадства ацэньвае паўстанне 1863–1864 гг. станоўча, як сумесную з палякамі і летувісамі барацьбу супраць Расійскай імперыі. На чале барацьбы стаў небагаты шляхціц Канстанцін Каліноўскі – беларускі рэвалюцыянер, публіцыст, паэт... Гэтая канцэпцыя замацавалася ў масавай свядомасці яшчэ ў савецкія часы і пасля атрымання Беларуссю незалежнасці займела лагічнае развіццё ў працах Г. Кісялёва, М. Біча, Я. Янушкевіча ды інш. У выніку большасць беларусаў разглядае паўстанне як гераічную старонку айчыннай гісторыі, а аднаго з яго кіраўнікоў – Кастуся Каліноўскага – многія не без падстаў лічаць нацыянальным героем Беларусі.

Такім чынам, гістарычная постаць К. Каліноўскага ўвайшла ў калектыўную памяць, уплывае на ўспрыманне беларусаў сябе як народа і зведвае адэкватны аналіз для далейшага ўпісання вобраза героя ў нацыянальны кантэкст. Тым не менш, існуе і альтэрнатыўны погляд. Шэраг гісторыкаў і публіцыстаў сцвярджаюць, нібыта ўзброены рух 1863 г. быў выключна польскім, варожым для беларусаў, называючы К. Каліноўскага польскім паўстанцам (а часам нават тэрарыстам ці бандытам), які ненавідзеў беларускі народ[1].

---

[1] А. Пілецкі, *Ён ненавідзеў беларускі народ: Гігін і Шымаў "развянчалі міф аб Каліноўскім"* [online], http://nn.by/?c=ar&i=103594 [доступ: 12.09.2016].

Да таго ж постаць К. Каліноўскага ў польскай гісторыі ўспрымаецца ў якасці аднаго з многіх рэгіянальных дзеячаў. У памяці мясцовых жыхароў К. Каліноўскі застаецца "палякам". Адмоўным бокам успрымання гістарычнай постаці з'яўляюцца заклікі, якія яму прыпісваюцца, да "знічтажэння праваслаўнага насельніцтва".

Напрыклад, настаяцель Свята-Уладзімірскай царквы, протаіерэй Аляксандар Велісейчык аддае пашану Мураўёву-вешальніку за пабудаваныя храмы і невілюе заслугі К. Каліноўскага: "У сістэме каардынат Каліноўскага напэўна не было месца ані для праваслаўнай царквы, ані для праваслаўных вернікаў"[1].

Аналагічных меркаванняў прытрымліваецца і сённяшні праваслаўны святар у Мастаўлянах.

Як правіла, падобныя сцвярджэнні падмацоўваюцца выхапленымі з кантэксту і гістарычнай канвы цытатамі з прац і загадаў К. Каліноўскага, з якіх толькі дзве можна не ставіць пад сумнеў у пытанні прыналежнасці аўтарства.

Востра крытычнае стаўленне кіраўніка беларуска-літоўскіх паўстанцаў да праваслаўнай царквы таксама актыўна выкарыстоўваецца для яго дыскрэдытацыі. Аўтарамі некаторых тэкстаў, дзе асоба К. Каліноўскага і само паўстанне 1863 г. прадстаўленыя выключна ў негатыўным асвятленні, сталі праваслаўныя святары.

У якасці найбольш яскравага прыкладу прывядзем брашуру вядомага беларускага літаратара з Жыровіцкага мужчынскага манастыра А. Бембеля, у якой аўтар, фактычна, наўпрост абвінавачвае К. Каліноўскага ў тэрарызме[2]. Шырокі распаўсюд паміж вернікаў падобных выданняў непазбежна прывяло да фарміравання ў часткі праваслаўных беларусаў рэзка адмоўнага, негатыўнага вобразу кіраўніка інсургентаў. Асабліва тое заўважаецца на Падляшшы, дзе аўтарытэт праваслаўнай царквы сярод этнічных беларусаў традыцыйна вельмі высокі.

У адрозненне ад тэрыторыі сучаснай Беларусі, дзе праваслаўная царква на працягу стагоддзяў была інструментам русіфікацыі беларускага народу, на Беласточчыне ў апошнія перыяды гісторыі яна наадварот спрыяла кансалідацыі беларускага насельніцтва. Стаўшы для беларусаў Падляшша фактычна нацыянальнай рэлігіяй, праваслаўе адыграла велізарную станоўчую ролю ў супрацьстаянні паланізацыі і захаванні беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці.

Таму рэзкія выпады К. Каліноўскага ў адрас праваслаўнай царквы выклікаюць асаблівае непрыманне ў многіх беластоцкіх беларусаў, і гэта становіцца падставай для ўзнікнення памылковых, а часам і зусім недарэчных чутак і ўяўленняў. Даводзіцца нават чуць, нібыта К. Каліноўскі заклікаў да масавых рэпрэсіяў супраць праваслаўнага кліру

[1] А. Пігалкіна, *Герой хутчэй не Каліноўскі, а граф Мураўёў* [online], http://www.t-styl.info/by/114/overview/9634 [доступ: 12.09.2016].

[2] А. Бембель, *Дастаеўскі і Каліноўскі. Спроба рэлігійна-маральнага супастаўлення лёсаў*, Жыровічы 2010.

і хацеў "павесіць усіх папоў". Спробы дэманізацыі постаці К. Каліноўскага ў вачах шырокай грамадскасці відавочныя. Але што стаіць за гэтымі спробамі? Якія для іх маюцца рэальныя гістарычныя падставы?

Міжканфесійныя стасункі ў Беларусі XIX ст. можна ахарактарызаваць як поўныя насцярожанасці і ўзаемнага недаверу. Яшчэ больш яны абвастрыліся пасля ліквідацыі ў 1839 г. уніяцкай царквы. У многіх мясцовасцях пераход уніятаў у праваслаўе быў прымусовым, суправаджаўся гвалтоўнымі захадамі і народнымі хваляваннямі.

Шматлікія польскія і краёвыя патрыёты лічылі скасаванне уніі і рэзкае ўзмацненне пазіцый праваслаўнай царквы пралічаным крокам імперскіх уладаў, накіраваным на паступовую асіміляцыю мясцовага насельніцтва і прывядзенне яго светапогляду да агульнарасійскіх канонаў. І ў выніку глядзелі на праваслаўе з раздражнёнасцю, як на праваднiка варожай расійскай ідэалогіі.

У сваю чаргу патрыёты Расійскай імперыі аналагічна глядзелі на каталіцкую царкву – як на шкоднае "лацінства", крыніцу падтрымання ў краі "польскага духу".

Узаемнае раздражненне напярэдадні паўстання дасягала піку, а з яго пачаткам нярэдка перарастала ва ўзаемную нянавісць.

К. Каліноўскі насамрэч вельмі рэзка выказваўся ў адрас праваслаўя, часта нават зняважліва называючы яго "схізмай" ("расколам"). Дарэчы, гэтае абразлівае слова было амаль традыцыйным у рэлігійных звадах таго часу і аднолькава ўжывалася як каталікамі ў дачыненні да праваслаўных, так і праваслаўнымі ў дачыненні да каталікаў.

Асабліва жорсткія выказванні гучаць у шостым нумары "Мужыцкай праўды", дзе аўтар ад імя селяніна Яськi – гаспадара з-пад Вільні – пагражае пакутамі ў пекле тым, хто не вернецца з праваслаўя назад ва ўніяцтва.

На першы погляд, усё відавочна.

Аднак, калі ўважліва ўчытацца ў тэксты К. Каліноўскага і прааналізаваць іх з улікам рэаліяў таго часу, у якім яны былі напісаныя, выяўляецца іншы сэнс напісанага. З аднаго боку мы бачым знішчальную крытыку праваслаўя, а з другога – гарачую абарону Уніі. І ў той жа час К. Каліноўскі адназначна прызнае, што спрадвечнай рэлігіяй беларускага народу было менавіта хрысціянства ўсходняга ўзору – "грэцкая вера": "[...] мы, будучы грэцкай веры, прызнавалі за намеснікаў Боскіх святых айцоў, што ў Рыме. Царом маскоўскім і гэта стала завідна, для таго, скасаваўшы ў Маскве грэцкую веру, а зрабіўшы царскую, што то называецца праваслаўе, і нас адарвалі ад праўдзівага Бога"[1].

Вынікае, што крытычныя выпады К. Каліноўскага датычацца не ўсяго праваслаўя, а выключна яго маскоўскай плыні. І пад самім тэрмінам "праваслаўе" ён разумеў не агульную назву ўсходнехрысціянскіх

[1] К. К а л і н о ў с к і, *За нашую вольнасць, Пісьмы з-пад шыбеніцы,* Мінск 1999, с. 41–42 [online], http://kalinouski.arkushy.by/archives/pismy.html [доступ: 20.09.2016].

цэркваў, а дзяржаўную рэлігію Расійскай імперыі. "Царскую веру", у якой "адно за цара да за цара маліціся трэба, як бы ўжэ цар быў Богам на свеце, а вера да казны належала"[1]. Бо ўніяты –практычна такія самыя праваслаўныя, розніцы паміж імі было няшмат. Галоўнае адрозненне было ў падпарадкаванні уніяцкай царквы Рымскаму папу. Значыцца, ключавым для будучага кіраўніка беларуска-літоўскіх паўстанцаў было менавіта пытанне падпарадкаванасці. К. Каліноўскі не толькі не быў супраць хрысціянства "грэцкага абраду" як царквы, незалежнай ад Маскоўскага патрыярхату, але і актыўна прапагандаваў такую царкву ў выглядзе Уніі.

Праваслаўе ў Расійскай імперыі насамрэч з'ўлялася магутным інструментам дзяржаўнага ідэалагічнага ўплыву на насельніцтва, і асабліва тое датычылася непісьменнага сялянства. Паўстанцкае кіраўніцтва не магло не прадбачыць, што з пачаткам узброенай барацьбы афіцыйная праваслаўная царква непазбежна зойме праўладную, варожую ў дачыненні да паўстанцаў пазіцыю, і будзе трансляваць гэтую пазіцыю вернікам. К. Каліноўскі гэта ўсведамляў таксама. І адсюль яшчэ рэзкасць ягоных выказванняў.

Безумоўна, словы беларускага рэвалюцыянера былі залішне катэгарычнымі. Нават укладзеныя ў вусны селяніна Яські, яны гучалі празмерна жорстка, абразліва, патыхалі Сярэднявеччам. Гэта не ўпрыгожвае К. Каліноўскага. Нават у ягоныя часы крытыка не мусіла быць зняважлівай і пагражальнай. Але ўлічваючы ўсё сказанае вышэй, а таксама ягоны гарачлівы характар, які не раз згадваюць мемуарысты, яго, прынамсі, можна зразумець.

Тым не менш, пры ўсім негатыўным стаўленні да афіцыйнай праваслаўнай царквы К. Каліноўскі нідзе і ніколі не заклікаў да масавых рэпрэсіяў супраць праваслаўнага духавенства і вернікаў. Гісторыі такія выпадкі невядомыя.

Наадварот, незалежна ад веравызнання, усе грамадзяне абвяшчаліся паўстанцамі вольнымі і роўнымі перад законам: "З сённяшняга дня ўсе сяляне і іншыя жыхары, якога б яны ні былі паходжання і веры, з'яўляюцца свабоднымі, як старапольская шляхта"[2].

Пытанне свабоды сумлення закранаецца і ў польскамоўнай паўстанцкай газеце "Głos z Litwy", да выхаду якой К. Каліноўскі меў непасрэднае дачыненне. Выданне прызнае: адной з прычынаў знішчэння былой Рэчы Паспалітай сталася тое, што яна "забылася аб праве веравызнанняў". І адначасова падкрэслівае, што адноўленая рэспубліка "[…] хоча свабоды каталіцызму, праваслаўю, юдаізму"[3]. Наўзамен ад насельніцтва патрабавалася лаяльнасць да цэнтральнага рэвалюцыйнага ўраду. Смяротнае пакаранне пагражала ва ўмовах ваеннага часу толькі

[1] *Ibidem*.

[2] К а л і н о ў с к і К. *За нашую вольнасць, Пісьмы з-пад шыбеніцы,* Мінск 1999, с. 95 [online], http://kalinouski.arkushy.by/ar chives/pismy.html [доступ: 20.09.2016].

[3] *Ibidem*, с.95

за “дзяржаўную здраду”, г. зн. за свядомую актыўную дзейнасць супраць паўстанцаў. І зноў жа – без розніцы веравызнання: “Калі хто не будзе паслушны гэтаму Маніфесту, ці ён пан, селянін, чыноўнік або хто іншы, будзе пакараны паводле польскіх ваенных законаў”[1] .

Ва ўласным *Прыказе да народу зямлі літоўскай і беларускай* К. Каліноўскі прытрымліваецца аналагічных прынцыпаў: “А хто гэтаму Прыказу спрэчан будзе, таго – ці ён поп, ці ксёндз, мужык ці пан, усякага данасіць да Ронду Польскага, каб можна было пазней павесіць або, зазваўшы Грамаду і зрабіўшы справядлівы суд, без адгаворкі весці на шыбеніцу! Бо хто хоча крыўды людской – той няхай лепш сам марна прападае!”[2]

Як бачым, за супрацьдзеянне *Прыказу* ва ўмовах паўстання маглі быць пакараныя роўна – і праваслаўны святар, і каталіцкі ксёндз.

Пра масавыя рэпрэсіі супраць праваслаўнага кліру з боку паўстанцаў, да якіх нібыта заклікаў К. Каліноўскі, гаворкі быць не можа. Вядомыя выпадкі забойстваў інсургентамі святароў Канстанціна Пракаповіча, Данілы Канапасевіча, Рамана Рапацкага[3], псаломшчыка Фёдара Юзафовіча, па-першае, былі выкліканыя актыўным іх садзейнічаннем расійскім уладам у падаўленні паўстання, а па-другое, што таксама вельмі важна, былі рэакцыяй, жахлівай помстай у адказ на расстрэл у Вільні каталіцкіх ксяндзоў Станіслава Ішоры, Раймунда Зямацкага[4]. Дарэчы, гэты апошні момант у тэндэнцыйнай кнізе Г. Шчаглова, прысвечанай гібелі Д. Канапасевіча і Ф. Юзафовіча, замоўчваецца[5].

Вяртаючыся да цытаванага *Прыказу* К. Каліноўскага, зазначым, што некаторым аўтарам ён падаецца празмерна жорсткім. Той жа А. Бембель у згаданай брашуры піша, што “калі б усе гэтыя інструкцыі і распараджэньні выконваліся, на Беларусі запанаваў бы крывавы хаос”[6]. Але трэба ўлічваць, што *Прыказ* гэты быў выдадзены К. Каліноўскім у адказ на жорсткі тэрор М. Мураўёва. І накіраваны быў, відавочна, супраць найбольш зацятых ворагаў паўстання.

Апрача таго, згадваючы ўспаміны Якуба Гейштара – ідэйнага апанента і калегу К. Каліноўскага па віленскім паўстанцкім цэнтры, нельга не прывесці выразнае сведчанне мемуарыста, які называе свайго было-

[1] *Ibidem*, c.75

[2] *Ibidem*, c.104-105

[3] В. Г р ы г о р ' е в а, У. З а в а л ь н ю к, У. Н а в і ц к і, А. Ф і л а т а в а, *Канфесіі на Беларусі*, Мінск 1998, с. 61

[4] *Rok 1863. Wyroki śmierci*, Wilna 1923. *Год 1863. Смяротныя прысуды*, s. 20, 52 [online], http://kalinouski.arkushy.by/library/rok_1863/spz.htm [доступ: 20.09.2016].

[5] Г. Щ е г л о в. *Год 1863. Забытые страницы*, Минск 2013.

[6] А. Б е м б е л ь, *Дастаеўскі і Каліноўскі. Спроба рэлігійна-маральнага супастаўлення лёсаў*, Жыровічы 2010, с. 9.

га супрацоўніка “шаленцам”[1] і “напоў-Маратам”[2] выключна ў тэорыі, а пазней дадае, што “тэрарызм у нас [быў] толькі на словах”[3].

Не лічылі К. Каліноўскага тэрарыстам ні расійскія следчыя, ні расійскія суддзі. Беларускі рэвалюцыянер быў пакараны смерцю за “за принятие звания члена революционного комитета Литвы, а после того главного распорядителя восстания в здешнем крае, а вместе с этим измену Государству и склонение к бунту жителей”[4].

Такім чынам, няма падставаў абвінавачваць К. Каліноўскага ў празмернай жорсткасці. Ягоныя суворыя загады і распараджэнні былі ў многіх пунктах справакаваныя акцыямі расійскіх уладаў. Дзейнічаць на сваёй пасадзе інакш ва ўмовах узброенага паўстання і рэальнага мураўёўскага тэрору ён не мог. Не знаходзяць ніякага пацвярджэння і папрокі ў татальнай фанатычнай нянавісці да праваслаўя. Аналіз тэкстаў беларускага рэвалюцыянера пераканаўча даводзіць, што ягоная вострая крытыка тычылася не праваслаўнай царквы ў цэлым, а толькі яе маскоўскай плыні, якая была ў Расійскай імперыі афіцыйнай рэлігіяй і актыўна выкарыстоўвалася дзяржавай як ідэалагічны апарат.

Вёскі Мастаўляны і Ялоўка – паселішчы сучаснага беларуска-польскага памежжа – ключавыя месцы, дзе прайшло дзяцінства К. Каліноўскага, і якія захоўваюць сукупнасць культурніцкіх кодаў і знакаў, якія патрабуюць фармалізацыі. Практыка мемарыялізацыі ў гэтых месцах зведвае ўплыў як асаблівасцяў нацыяльнай ідэнтычнасці і гістарычнай памяці насельніцтва, так і аспектаў дзяржаўнай палітыкі абедзвюх краін.

У Мастаўлянах месца, дзе стаяла сядзіба Каліноўскіх, аніяк не абазначана і не падпадае пад планы аднаўлення на дзяржаўным узроўні. У першую чаргу на гэта ўплывае той факт, што фрагменты сядзібы знаходзяцца на прыватнай тэрыторыі. Лідар „Беларускай Нацыянальнай Памяці” Анатоль Міхнавец зазначае: “У нас былі спробы і размовы з гаспадарамі, каб набыць зямлю ва ўласнасць і мець магчымасць ушанаваць памяць Каліноўскага. Крыўдна, калі прыязджаем сюды, а нам кажуць, што ніякіх помнікаў тут не будзе”.

На сённяшні дзень сляды фундамента сядзібы схаваны ад мінакоў. На відавоку толькі кутны камень падмурка. Да гэтага кутнага каменя прыязджаюць турысты, ладзяцца лыжныя рэйды, дзе ўдзельнікі на гэтым месцы чытаюць гістарычныя выступы.

27 красавіка 2013 на цэнтральным перакрыжаванні ў Мастаўлянах быў урачыста адкрыты памятны знак у гонар К. Каліноўскага і паўстан-

[1] J. G i e y s z t o r, *Pamiętniki z lat 1857–1865*, t. 2, Kraków 1913, s. 237–238.

[2] К. К а л і н о ў с к і, *За нашую вольнасць*, *Пісьмы з-пад шыбеніцы,* Мінск 1999, с. 156 [online,] http://kalinouski.arkushy.by/ar chives/pismy.html [доступ: 20.09.2016].

[3] J. G i e y s z t o r, *Pamiętniki z lat 1857–1865*, t. 2, Kraków 1913, s. 51; К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць*, *Пісьмы з-пад шыбеніцы,* Мінск 1999, с. 158 [online], http://kali nouski.arkushy.by/ar chives/pismy.html [доступ: 20.09.2016].

[4] *Следча-судовая справа Кастуся Каліноўскага*, Мінск 2014.

ня 1863–1864 гг.: "Pamięci/ Konstantego Kalinowskiego/ (1838–1864)/ urodzonego w Mostowlanach/ w 150. rocznicę/ Powstania Styczniowego 1863 r./ rodacy, 2013 r."

Аўтар помніка Януш Талуць адзначыў акалічнасці задумы: "Нарэшце гэты чалавек, які нарадзіўся ў нашай краіне, на нашай зямлі ўшанаваны. Яго не чутна тут, не відаць нідзе. І трэба было, каб не шыльда была, а каб быў помнік, каб можна было ганарыцца гэтым чалавекам. Я моцна хацеў, каб гэты помнік паўстаў. Каб ён быў годны, каб не было сорамна. І Каліноўскаму няма чаго сароміцца, бо быў герой. І каб помнік быў годны яго. Тут не было дастаткова сродкаў, і ён зроблены сціпла. Тое кола, якое стаіць, кавалак стрэльбы, каса сімвалізуюць тую вайну, калі прывозілі параненых, а каса – гэта бяда, што паўстанцы не мелі ўзбраення, каб ваяваць з царскімі войскамі"[1].

Да 2006 года ў Мастаўлянах таксама мелася школа імя К. Каліноўскага, якая была ліквідавана[2].

Вёску Ялоўку можна лічыць сымбалічнай "калыскай" паўстанцаў. У паселішчы колісь стаяў касцёл, дзе хрысцілі К. Каліноўскага. Да нядаўняга часу ля будынка мясцовай плябані захоўвалася надмагілле ксяндза Францішка Кажанеўскага, які і ахрысціў 4 красавіка 1838 г. хлопчыка імём Канстанцін. Надмагілле знікла невядомым чынам і патрабуе росшуку.

У сучасным Ялоўскім касцёле захоўваецца абраз Паўстанцкай Божай Маці, якой былі бласлаўлёны паўстанцы перад паходам "на Літву". Па меркаванні даследчыцы з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Галіны Флікоп дадзены абраз уяўляе сабою копію абраза Божай Маці Чанстахоўскай. Па ім можна дакладна датаваць твор – сярэдзіна XIX ст. Але няма аніякіх падставаў лічыць яго ўніяцкім, хоць такая гіпотэза і існавала: ні па іканаграфіі, ні па перыядзе стварэння.

Аўтар абраза невядомы. Відавочна, што высокай прафесійнай адукацыі ў яго не было. Аднак мастацкая падрыхтоўка ў аўтара абраза пэўная была: ён яе мог атрымаць, напрыклад, ад бацькі (раней было распаўсюджанае існаванне мастакоўскіх дынастый) або дзесьці навучаўся асновам жывапісу. Памеры абраза паказваюць на тое, што ён пісаўся для храма.

Мемарыялізацыя памяці аб паўстанні 1863–1864 гг. можа ісці некалькімі шляхамі і патрабуе супрацы беларускага і польскага бакоў, як на дзяржаўным узроўні, так і шляхам узаемадзеяння навукоўцаў і спецыялістаў, каб пазбегнуць вузкасці, і як вынік, сэнсава-культурнай абмежаванасці рэтрансляцыі падзеяў.

---

[1] *Урачыстае адкрыццё помніка Кастусю Каліноўскаму ў Мастаўлянах* [online], http://www.racyja.com/sumezhzha/urachystae-adkrytstsyo-pomnika-kastusyu-k/ [доступ: 20.09.2016].

[2] *Katalog miejsc pamięci powstania styczniowego w województwie podlaskim*, Białystok 2013, s. 37–38.

Некаторымі з прапанаваных практычных захадаў з’яўляцца стварэнне памежнага турыстычнага маршруту па месцах памяці, усталяванне памятных знакаў, супольныя мерапрыемствы анімацыі падзеяў, аднаўленне сядзібы Каліноўскіх у якасці музейнага аб’екта.

Журналіст Аляксандр Вярбіцкі ў 2007 годзе пры апісанні дарогі між Ялоўкай і Мастаўлянамі адзначаў турыстычную непрывабнасць шляху: “Пакуль што няма там яшчэ нейкіх тыповых прыманак, што прыцягвалі б масавага наведвальніка”[1]. Тэндэнцый да змены сітуацыі пакуль не назіраецца[2]. Лагічнымі прадстаўляюцца мерапрыемствы па інтэрпрэтацыі названай дарогі, якую можна раскласці на тры складнікі: а) сама дарога; б) ландшафт (краявід) з дарогі; в) рэшта.

Дарога самастойна можна інтэрпрэтавацца як культурны слой. Напрыклад, у Італіі на старых рымскіх дарогах (Via Romana) робяць раскопкі, уладкоўваюць экспазіцыйныя зандажы, дзе падаюць інфармацыю, які слой і калі ўтварыўся. Аналагічны зандаж можа быць створаны і на дарозе Мастаўляны-Ялоўка: слой 1 – Станіслаў Аўгуст Панятоўскі; слой 2 – К. Каліноўскі (ягоны час); слой 3 – Юзаф Пілсудскі, слой 4 – Война Ярузэльскі.

Паколькі па дарозе ездзіў транспарт, можна зрабіць экспазіцыйную пляцоўку – бакавы з’езд, на якой размесцяцца віды транспартных сродкаў (ці рэканструкцыі іх) з розных часоў. У Каўнасе маецца пад шкляным каўпаком аўтэнтычная брычка).

Ландшафт, што адкрываецца па абодва бакі дарогі можна інтэрпрэтаваць наступным чынам. Прааналізаваць гістарычныя мапы з розных часоў з дарогаю Мастаўляны–Ялоўка ды параўнаць з тым, што цяпер маецца, і там, дзе ландшафт супадае з гістарычным, паставіць адпаведныя інфармацыйныя шыльды, на якіх напісана, што турыст зараз аглядае такі ж ландшафт, які маглі бачыць “каліноўцы” падчас паўстання. Тыповая падобная шыльда стаіць на гары Трох крыжоў у Вільні. Да ўсяго ландшафт (ці ягоныя часткі) можна паставіць пад ахову як гістарычныя. У Італіі, для прыкладу, дзейнічае фонд, які абараняе ўсяго толькі адзін гістарычны ландшафт пад Фларэнцыяй, з якога адкрываецца на Фларэнцыю такі ж від, як і пры Дантэ.

Элементы інфраструктуры вакол дарогі таксама патрабуюць асвятлення. Гэта могуць быць касцёл, сядзіба ўдзельніка паўстання, могілкі паўстанцаў ці іх родзічаў і г. д. Такім чынам, можна інтэрпрэтацыю пашырыць з самой лініі дарогі на навакольную мясцовасць, зрабіць шэраг маршрутаў.

Нарэшце, дарога – гэта і тыя асобы, хто па ёй ездзіў ці хадзіў. Таму варта інтэрпрэтаваць і іх. Вось, напрыклад, В. Ляхар у сваёй кнізе *Вайсковая сімволіка беларусаў* прыводзіць уласныя ілюстрацыі

[1] А. В я р б і ц к і, *Як у скансэне*, “Ніва”, № 18 (2660), 6 мая 2007 г.

[2] *У якім касцёле насамрэч хрысцілі Кастуся Каліноўскага?* [online], http://www.racyja.com/vandrouki/dze-nasamrech-khrystsili-kastusya-kalino [доступ: 29.09.2016].

паштовай службы ВКЛ розных стагоддзяў – іх можна выкарыстаць тамсама.

Можна паказваць выявы мясцовых жыхароў, прычым, яшчэ з даўніх часоў, калі толькі ў Падляшшы з’явілася тая дарога. Завяршыць паказ можна выявамі сучасных жыхароў той мясцовасці і нашчадкаў паўстанцаў, якія там цяпер і не жывуць, але іх продкі хадзілі па той дарозе.

Нарэшце, можна рабіць тэатральныя акцыі, прысвечаныя як паўстанню, гэтак і жыццю рэгіёна ў розныя часы, дзе сцэнаю будзе выдзелены на пэўны час участак дарогі.

*Dzmitry Kuzmenka, Volha Siamashka*

**Practice and Problems of Memorialization on the Lands of the Uprising of 1863–1864 (Mostowlany and Jalowka)**

A b s t r a c t

The article deals with problems of introducing the historical figure of Kalinouski in collective memory, its impact on the perception of Belarusians as a nation as well as the problem of providing an adequate analysis for fostering the image of the hero in the national context.
Preserving memories of the uprising of 1863-64 with the example of Mostovlyany and Jalowka can be done by various manners, including creating a cross-border tourist route to the places of importance, installing memorial signs, organizing animation events or restoring the manor of the Kalinouski family and transforming it into a museum.